УДК 947.6

П. С. Кручак, асістэнт

# ПРАБЛЕМА БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ Ў ПРАЦАХ В. ЛАСТОЎСКАГА

Праблема станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці займала адно з важнейшых месц у творчасці вядомага беларускага гісторыка і грамадскага дзеяча В.Ю.Ластоўскага (1883-1938), аўтара першай папулярнай гісторыі Беларусі «напісанай беларусам і для беларусаў».

Пачатак разгляду дадзенай праблемы аўтар здзейсніў у сваёй першай працы «Кароткая гісторыя Беларусі» і завяршаў яе ў шэрагу артыкулаў, надрукаваных у пачатку 20-х гадоў у часопісе «Крывіч» пад псеўданімам Юрый Верашчака.

Перш за ўсё В.Ластоўскі паспрабаваў знайсці вытокі ўтварэння беларускай дзяржавы. Ён адзначаў, што дзяржавы ўтвараюць толькі народы з ярка выражанымі індывідуальнымі рысамі або з ярка акрэсленымі імкненнямі. Для ўтварэння дзяржавы народу трэба мець пачуццё свайго гістарычнага пасланніцтва. Асновай нашай нацыянальнай індывідуальнасці, па яго меркаванню, з'яўляюцца гістарычныя традыцыі і традыцыйная народная культура (Верашчака Ю. Што спрыяе разросту і ўпадку народаў і дзяржаў //Крывіч.- 1926.- С.85). Не меншае значэнне , на думку Ластоўскага, мае і імя народа, бо яно вынік гістарычнага лёсу. Таму гісторык і ўдзяліў дадзенай праблеме асабліва пільную ўвагу.

Аўтар адзначыў, што «няма ніводнага народа, які б на працягу ўсёй сваёй гісторыі насіў адно і тое самае імя... Пад уплывам пераменаў і чужаземных заваяванняў, змены пануючай дынастыі або веры і г.д. найменні народаў і дзяржаў змяняліся»...(Верашчака Ю. Аб найменні «Гуды», «Крывічы», «Русь» // Крывіч.- 1923.- № 1.- С. 17). В.Ластоўскі прааналізаваў асноўныя гістарычныя назвы беларускіх зямель - «Гудаў» (як называюць літоўцы), «Крэву» (як беларусаў называюць латышы) і асабліва - гісторыю ўзнікнення назвы «Русь». На яго думку, пашырэнне імя «Русь» на тэрыторыю крывічоў адбывалася не дынастычным парадкам, а шляхам пашырэння хрысціянства. «Хрысціянства, якое спачатку было верай пануючага класа, князёў і дружыны, верай русаў, атрымала найменне «рускай веры». «Рус» і «хрысціянін» былі найменнямі ўзаемна сябе пакрываючымі... За 200 гадоў увесь усходнеславянскі абшар становіцца хрысціянскім і прыбірае імя «Русь». Таму і назва «Беларусь», на думку Ластоўскага, пераходная ступень, частка рускага кангламерату. Вучоны прапануе называць краіну «Крывія», бо гэта назва найбольш поўна адцяняе нашу індывідуальнасць у гістарычнай мінуўшчыне (Верашчака Ю. Аб найменні «Гуды», «Крывічы», «Русь» //Крывіч.- 1923.-№ 1.-С. 23).

У сваёй канцэпцыі гісторыі беларускай дзяржаўнасці В.Ластоўскі схіляўся да ідэалізацыі, нават апалагетыкі старадаўняга беларуска-крывіцкага перыяду нашай гісторыі. Па яго меркаванню, Беларусь, або Крывія, пачалася ў дахрысціянскія часы як вялікая дзяржава, што ахоплівала цэнтральны арэал усходнеславянскага рассялення і летапісную Літву. Галоўнай воссю канцэпцыі Ластоўскага была ідэя вялікай Крыўскай (Беларускай) дзяржавы, увасабленнем якой з'явіўся полацкі князь Усяслаў Чарадзей, які не жадаў уступаць першынства іншым народам і дзяржавам.

Полацкія крывічы мелі гістарычны шанс стварыць магутную дзяржаву. Але ў другой палове XII ст., аслабленыя ўдзельным драбленнем і ваеннай канкурэнцыяй з Кіеўскім княствам, Полаччына страціла сваё значэнне як адзін з цэнтраў усходнеславянскіх зямель. Полацкі перыяд нашай гісторыі завяршыўся.

З сярэдзіны XII ст. В.Ластоўскі пачынае другі перыяд беларускай гісторыі і беларускай дзяржаўнасці. Гэта перыяд аб'яднання старадаўніх беларускіх зямель, далучэнне да яе верхнянёманскай летапіснай Літвы, Украіны, Жамойці і іншых прыбалтыйскіх зямель. Пры гэтым вучоны прытрымліваўся памылковага пункту погляду пра полацкае паходжанне літоўскіх князёў і падкрэсліваў ролю крывічоў у стварэнні ВКЛ з цэнтрам у Навагрудку. В.Ластоўскі называе новую дзяржаву Літоўска-Рускім, або Літоўска-крывічанскім княствам. Вучоны падкрэсліваў важнае значэнне беларускага элемента ў новай дзяржаве і ў пацвярджэнне сваёй пазіцыі прыводзіць факт, што вялікі князь Літоўскі і кароль польскі Ягайла, яго сыны да канца свайго жыцця размаўлялі на беларускай мове. Па-беларуску гаварылі да XVI ст.і іншыя князі з роду Гедэміна.

Другі перыяд беларускай гісторыі працягваўся да 1430 г.- часу смерці вялікага князя Вітаўта. Як падкрэсліваў В.Ластоўскі, «з гэтага часу асобная гісторыя Беларусі канчаецца: гэтая старонка пачынае жыць агульным жыццём перш Літвы і Русі, а з 1569 г. і Польшчы» (В.Ластоўскі. Кароткая гісторыя Беларусі.-С. 30). Трагічнай старонкай у гісторыі беларускай дзяржаўнасці гісторык лічыць Люблінскую унію 1569 года. Яе аўтар лічыць, як і большасць расійскіх гісторыкаў XIX - пач. XX ст., капітуляцыяй Літоўска-беларускай дзяржавы перад Польшчай.

З гэтага часу В.Ластоўскі пачынае чацвёрты перыяд беларускай гісторыі. Беларусь у складзе Рэчы Паспалітай, які працягваўся да канца XVII ст., - перыяд масавай паланізацыі і знішчэння апошніх праваў беларускай дзяржаўнасці. Нічога істотнага не змянілася ў лёсе беларускага народа і пасля ўключэння краю ў склад Расійскай імперыі. Паланізацыя змянілася палітыкай русіфікацыі і знішчэннем апошніх праваў беларушчыны. Такая палітыка працягвалася да 1905 г., калі разам з іншымі

свабодамі, дадзенымі насельніцтву Расійскай імперыі і беларусам, было дазволена друкаваць кнігі і газеты на роднай мове. Пачаўся новы перыяд змагання за беларускую дзяржаўнасць, які завяршыўся ў сакавіку 1918 г. абвяшчэннем Беларускай Народнай Рэспублікі. І нездарма В.Ластоўскі, які марыў аб гэтым усё сваё жыццё, заявіў у сваім выступленні на пасяджэнні Рады БНР у ноч на 25 сакавіка 1918 г.: «Няхай жыве незалежная Беларусь у сваіх этнаграфічных межах» ( Янушкевіч Я. Пра мяне...//Крыніца.-1994.-№ 8.- С. 9).

Такім чынам, праблема беларускай дзяржаўнасці займала вялікае месца ў працах В.Ю.Ластоўскага. Пры гэтым аўтар часта схіляўся да ідэалізацыі мінулага сваёй Радзімы. Ён з'яўляўся хутчэй яе папулярызатарам і прапагандыстам, чым сталым кабінетным вучоным, бо бачыў у гісторыі «фундамент, на якім будуецца жыццё народа». І для таго, каб адбудаваць сваё жыццё, сваю незалежную дзяржаву, пачаць трэба было з фундаменту. Гэтую місію і ўзяў на сябе Вацлаў Ластоўскі.

УДК 947.6

А.А. Райченок, ассистент

## ПРОБЛЕМЫ ГОСУДАРСТВЕННОСТИ В БЕЛОРУССКОМ НАЦИОНАЛЬНОМ ДВИЖЕНИИ ПОСЛЕ ФЕВРАЛЬСКОЙ РЕВОЛЮЦИИ

Февральская революция придала мощный импульс белорусскому национальному движению. В первых числах марта 1917 г. в Белорусском беженском комитете собрались представители белорусских организаций Петрограда. Среди них вспыхнули горячие споры о дальнейшем направлении работы. Как показала дискуссия, большинство участников собрания стояло на платформе БСГ.

15 марта принимается Декларация белорусской народной организации в Петрограде, которая в скором времени была опубликована в «Известиях Петроградского Совета рабочих и солдатских депутатов». В ней, в частности, говорилось: «Мы верим, что Учредительное собрание правильно разрешит вопрос и преобразует Россию на началах Федеративной Республики» (НА ф.60, оп.3, д.175, л.1). Выдвигались требования введения преподавания в школах на национальном языке, участия местного населения в самоуправлении, а администрации, назначаемой центральным правительством, быть знакомой с краем, бытом и языком народа, проживающего в данной местности.

25 марта в Минске состоялся съезд белорусских национальных организаций, который положил организационное начало их открытой деятель-